# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 1 Верасень 2016***

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*


# Фінансавая граматнасць




## СПЕЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ

***ГІСТОРЫЯ ГРОШАЙ.*** Цяжка сабе ўявіць сучаснае жыццё без грошай. ***Грошы – гэта мера кошту, сродак плацяжу, адна з формаў назапашвання зберажэнняў.*** Пры выкарыстанні грошай вытворца тавару мае магчымасць прадаць свой тавар сёння, а купіць сыравіну, напрыклад, толькі праз тыдзень. Пры гэтым ён можа прадаць свой тавар у адным месцы, а купіць патрэбны яму зусім у іншым. Такім чынам, грошы як сродак звароту пераадольваюць часовыя і прасторавыя абмежаванні пры абмене. Гэта найважнейшае вынаходніцтва чалавецтва, без якога развіццё грамадства было б немагчымым.



***Даволі доўга чалавек абыходзіўся без грошай.*** Многія тысячагоддзі адзіным спосабам атрымаць жаданае служыў просты абмен таварамі або, інакш кажучы, бартэр. Лішкі ўласнай вытворчасці абменьваліся на лішкі, наяўныя ў іншых. Абмен стаў насіць пастаянны, масавы характар, і рынак быў галоўным месцам грамадскага жыцця. Аднак на рынку ўсё часцей ўзнікалі праблемы, якія цяжка было вырашыць. Які кошт адной лыжкі? Ці каштуе конь больш, чым фурманка? Людзям трэба было штосьці больш кампактнае. Некаторы час разнавіднасцямі "грошай" служылі ракавінкі, скуры, тытунь, збожжа, бабы, соль. Але і гэта было не зусім зручна.



І вось з VII стагоддзя да нашай эры ў якасці разлікаў сталі выкарыстоўвацца высакародныя металы, золата і срэбра, якія не іржавеюць. ***З каштоўных металаў пачалі рабіць грошы.*** Пазней у залатыя і срэбныя манеты сталі дадаваць розныя металічныя сплавы. І ў выніку кавалачкі металу выцеснілі ўсе астатнія "тыпы грошай". Гэты этап быў самым працяглым.



*Асаблівай увагі заслугоўвае паходжанне папяровых грошай.*
*Адкуль з'явіліся папяровыя грошы?*
*Для адказу на гэтае пытанне*
*неабходна зноў звярнуцца да гісторыі.*

***Першыя папяровыя грошы з'явіліся ў Кітаі ў 910 годзе нашай эры.*** Металічныя манеты было даволі цяжка перавозіць, таму ўрад задумаўся аб выкарыстанні ў разліках папяровых грошай. Яны сталі плаціць купцам не манетамі, а спецыяльнымі сертыфікатамі, якія лёгка разменьваліся на залатыя або срэбныя манеты. На гэтых сертыфікатах друкавалі важных людзей, чыноўнікаў, ставілі свае подпісы і пячаткі.






У Еўропу папяровыя грошы, як сведчаць гісторыкі, былі завезены падарожнікамі, і першыя папяровыя грошы тут былі надрукаваны ў канцы XVII стагоддзя.






Schwedisches Papiergeld vom Jahre 1663.

У Расіі першыя папяровыя грошы былі ўведзены пры Кацярыне ІІ (1769 год). Называліся яны ***асігнацыямі.*** Але гэта былі не тыя папяровыя грошы, якія мы ведаем цяпер, а даўгавыя абавязацельствы. Цяпер бы мы іх назвалі ***аблігацыямі***. У банку іх можна было абмяняць на медныя манеты.









Калі ж з'явіліся першыя папяровыя грошы
на тэрыторыі Беларусі?
А пра гэта мы даведаемся ў наступным нумары…



# ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА ГРОШЫ.

Давайце пагаворым пра грошы, а дакладней – разгледзім самыя цікавыя факты пра іх. Бо гэтыя папяровыя купюры або металічныя манеткі ў розных людзей выклікаюць розныя эмоцыі. Радасць, гонар, спакой, зайздрасць і нават расчараванне. І, у той жа час, мала ў каго яны выклікаюць абыякавасць. Якія ж незвычайныя і дзіўныя існуюць звесткі пра грошы?

1. «Капейка» бярэ свае вытокі з часоў праўлення Івана Грознага. Менавіта ён загадаў чаканіць «грошы копейныя» са сваёй выявай.



2. У розныя часы ў выглядзе грошай выкарыстоўваліся розныя прадметы, якія прадстаўлялі каштоўнасць для людзей той ці іншай эпохі. Гэта былі і пліткі гарбаты, і сушаная рыба, і ўгнаенне, і камяні.

3. Грашыма, выраблены́мі з пластыка, сёння карыстаюцца жыхары Аўстраліі і некаторых краін Паўднёвага паўшар'я Зямлі.

4. Самая цяжкая залатая манета была выпушчана ў Кітаі. Яе вага складала 5 кілаграмаў.

5. Самая цяжкая сярэбраная манета была выпушчана ў Расіі ў 1999 годзе. Яе вага – 3 кілаграма.






6. У Канадзе было выпушчана 25 тысяч унікальных манет, на адным баку якіх намаляваны дыназаўры. У цемры свяціўся іх шкілет. На жаль, у абарот такія грошы не патрапілі.

7. Каб на новай купюры ўтварылася характэрная пацёртасць на згібе, трэба скласці яе 4 тысячы разоў.




8. Для правядзення буйных банкаўскіх аперацый у Англіі існуе купюра вартасцю ў 1 мільён фунтаў стэрлінгаў.

9. Самая распаўсюджаная валюта ў свеце – франк. Яе выкарыстоўваюць у 34 краінах.

10. Самыя папулярныя даляравыя купюры ў ЗША – 1 і 20 даляраў. А ў свеце больш распаўсюджаныя 100-даляравыя купюры.




11. Самыя першыя грошы ў папяровым выглядзе з'явіліся ў Кітаі ў 910 годзе.

12. Цікавыя факты пра грошы дазваляюць паглыбіцца ў гісторыю развіцця чалавецтва. Значок «$» быў прыдуманы ў 1788 годзе Оліверам Поллакам.



13. У ЗША закон забараняе адлюстроўваць на грошах жывых людзей.

14. Аляксандр Македонскі лічыцца першым кіраўніком, які загадаў чаканіць манеты са сваёй выявай.



15. Самая цяжкая манета мінулага была ў XVIII стагоддзі ў Швецыі. Важыла яна 19 кілаграмаў.

16. Назвы многіх грашовых адзінак утварыліся ад мер вагі. Стэрлінгамі ў мінулым называлі срэбныя манеты, а 240 такіх манет складалі па вазе адзін фунт. Адсюль – і фунт стэрлінгаў Вялікабрытаніі. Ліра з'яўляецца эквівалентам фунта. Марка (крыху лягчэй фунта) таксама выкарыстоўвалася для вызначэння вагі срэбра.

17. Першымі купюрамі ў Канадзе выступалі ігральныя карты.

18. Першы банкамат з'явіўся ў 1939 годзе.



19. Старажытнагрэцкая дэкадрахма – самая дарагая манета ў свеце. На аўкцыёне ў Цюрыху яна была прададзена за 314 тысяч даляраў.



20. Да сярэдзіны XX стагоддзя ў некаторых краінах Афрыкі людзі выкарыстоўвалі жывёлу ў якасці грашовай адзінкі.

21. У сярэдзіне XX стагоддзя ў Бельгіі ў абароце былі манеты з рэкламным тэкстам.

22. Бронзавыя манеты Старажытнага Кітая адліваліся ў выглядзе прылад працы людзей.



23. У XVI стагоддзі ў Венецыі была распаўсюджана манета з вельмі цікавай назвай – «газета».

24. Да 1826 года ў абароце былі грошы, зробленыя са скуры цюленя. Сёння нават адна такая антыкварная манетка каштуе столькі ж, як і кавалачак золата такой жа вагі.



25. Напэўна, манеткі збіраюць усе дзеці свету. Як правіла, потым яны трацяцца на любімыя прысмакі і цацкі. А вось у Японіі з манет, сабраных дзецьмі, былі выліты званы свету. Адзін з іх быў усталяваны ў Нью-Ёрку.

26. Ёсць звесткі, што ў Дамініканскай рэспубліцы грошы да гэтага часу выкарыстоўваюць у якасці гір для ўзважвання. Для прастаты і выгоды на 10-цэнтавай манетцы адчаканена пазначэнне «10 грам».

ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына